

*Грынявіцкі касцёл францысканцаў. Сучасны выгляд.*

тэр'ер былі зменены пры перабудове касцёла пад праваслаўную царкву. У верхнім ярусе размяшчалася арачнае акно з кілепадобным абрамленнем, у полі франтона — круглы праём. Кароткія бакавыя нефы дэкарыраваны ў міжаконнях пілястрамі, аперазаны прафіляваным карнізам, прарэзаны аконнымі праёмамі з лучковымі завяршэннямі. Захаваліся сцены. Храм унесены ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Касцёл не дзейнічае.

*А.М.Каласоўская.*

**ГРЫЎНЯ**, вагавая, лікавая і грашовая адзінка 11—17 ст. Назва паходзіць ад стараж. ўпрыгожання — *грыўні шыйнай*. 1) Г. серабра — вагавая адзінка масай 204,756 г; сярэбраны плацежны злітак — грашовая адзінка 11—15 ст. На тэр. Беларусі вядомы 3 віды: літоўская (ізрой) 13—15 ст. (100—105 г), кіеўская (140—165 г) і наўгародская (каля 204 г), таксама палавінныя абрубкі літоўскіх і наўгародскіх Г. — палціны. 2) Г. кун — лікава-грашовая адзінка, якая адпавядала пэўнай колькасці манет: у 11 ст. роўная 20 нагатам, 25 кунам, 50 разанам; у 12 ст. — 25 нагатам, 50 кунам. 3) Г. польск. — грашова-вагавая адзінка (каля 210 г), прынятая ў Польшчы каля 1170, бытавала на тэр. Беларусі і Украіны як вартасны эквівалент 48 *грошаў пражскіх* (14 — пач. 16 ст.), 48 грошаў польск. або 39,4 *гроша літоўскага* (16—17 ст.).

**ГРЫЎНЯ ШЫЙНАЯ**, жаночае і мужчынскае ўпрыгажэнне накшталт абруча з каляровых (медзь, бронза, серабро, білон, золата) і чорных (жалеза) металаў, якое насілі на шыі, прыкмета высокага сац. статусу яго ўладальніка. Г.ш. адрозніваюцца па форме, памеры, дэталях афармлення. Характэрны для народаў розных краін свету з часоў неаліту і бронзавага веку. У цэнтр. Еўропе пашырыліся ў латэнскі час пад уплывам кельтаў у 5—1 ст. да н.э. На тэр. Беларусі Г.ш. з'явіліся ў раннім жалезным веку (скіфы, мілаградская і днепрадзвінская археал. культуры), вядомы ў раннім сярэдневякоўі (5—7 ст.; калачынская, пражская археал. культуры), найб. шырока выкарыстоўваліся ў 9—13 ст. Значная колькасць Г.ш. знойдзена ў культ. пластах гарадоў, паселішчаў, курганных пахаваннях і скарбах стараж.-рус. часу.

*Ю.У.Каласоўскі.*

**ГРЫФО́Н** (грэч. gryps, лац. gpyphus, франц. griffon), міфалагічная істота, якая ўяўлялася фантаст. пачварай з тулавам ільва, крыламі арла і львінай ці арлінай галавой. Меў вострыя кіпцюры і беласнежныя ці залатыя крылы. Паводле стараж.-грэч. міфаў, гэтая містычная істота ўвасабляла ўладу над небам і зямлёй, магутнасць, пільнасць і гонар. У геральдыцы часцей адлюстроўваўся бяскрылы марскі Г. з рыбіным хвастом, што замяняў яму «львіную» частку цела. У антычную эпоху выявы Г. ствараліся на шлемах, манетах, яго фігуры ўпрыгожвалі будынкі, пасудзіны, увасабляліся ў сярэднія вякі ў мастацтве Усходу як дэкар. і геральдычны элементы.

На тэр. Беларусі выява Г. атрымала пашырэнне ў 12—14 ст. у дэкоры зброі, прадметаў побыту, кніжных мініяцюрах (*Полацкае евангелле*, 13—14 ст.; *Мсціжскае евангелле*, 14 ст.; *Смаленскі псалтыр*, 1395). Пазней сустракаецца ў кніжнай графіцы (выданні П.*Мсціслаўца*, 16 ст.), на гербах і інш. Рэльефныя выявы Г. былі пашыраны на *Навагрудскай кафлі* (14—17 ст.), *Віцебскай кафлі* (14—18 ст.), *Заслаўскай кафлі* (15—18 ст.). Цяпер Г. з'яўляецца папулярным персанажам твораў жанру фэнтэзі.

*А.М.Аляхновіч.*





***Грыўня**: 1 — чарнігаўскага тыпу, 2-я пал. 13 ст.; 2 — кіеўскага тыпу, 11—13 ст.; 3 — наўгародскага тыпу, 13—14 ст.; 4 — палова грыўні наўгародскага тыпу; 5 — заходнярускага (літоўскага) тыпу, 14—15 ст.*

**ГРЫЦКАВІЦКАЯ СПА́СА-ПРААБРАЖЭ́НСКАЯ ЦАРКВА́**, помнік архітэктуры з рысамі барока і класіцызму ў в. Грыцкавічы Крупскага р-на. Пабудавана ў 1850 з дрэва. Уключае асн. прамавугольны ў плане аб'ём на бутавым падмурку, 5-гранную апсіду, 2 нізкія бакавыя прыдзелы: рызніцу і ахвярнік. Асн. аб'ём накрыты вальмавым дахам, у цэнтры якога ўзвышаецца невял. макаўка на шатровым



***Грыўня шыйная** з гарадзішча Вежкі. 7 ст.*